Міхась ЦУБА

**Мяцеліца**

Замяць віхрам сцелецца
Скрозь сняжынак рой —
Падары, мяцеліца,
Радасны настрой.
Акуні, мяцеліца,
Нас у снежны рай,
У казку хай паверыцца
І ў дзівосны край.
Хай паўсюдна зменіцца
Колер на зямлі,
Забялі, мяцеліца,
Вёскі, гарады.
Беленькім абрусам
Усё пакрый спаўна,
Людзям-беларусам
Пажадай дабра.
Каб у час, што мечаны
Душу нам сагрэць,
І марозным вечарам
Новы год сустрэць.
Нас парадуй ёлачкай
І мяцці, мяцці...
Кожнаю іголачкай
У свята засвяці.
І няхай вяселіцца
Бура за акном —
Намяці, мяцеліца,
Шчасця поўны дом.